Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»

# *Па вуліцах родната горада*

***Метадычныя рэкамендацыі***

***па правядзенню экскурсіі па гораду Докшыцы***

Укладальнік – педагог дадатковай адукацыі Вайцяховіч А.В., кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Турызм”

Над Бярэзінай ціхай, дзе з ранку палошчуцца
Лебядзіныя крылы ў чыстай вадзе,
Гарадок невялікі пад назваю Докшыцы
Стаў паселішчам шчырых і добрых людзей.

*Вікенцій Карповіч*

Любоў да Радзімы мае перадумовай веданне мінулага свайго народа – яго перамог і паражэнняў, здабыткаў і страт, яго герояў, вялікіх майстроў, помнікаў духоўнай і матэрыяльнай культуры.

Памяць патрабуе клопату. Гэта тым больш тычыцца мінуўшчыны беларускага народа, які так часта апынаўся пад смерчам ваенных дзеянняў і цярпеў нязменныя страты людзей, каштоўнасцей, духоўных скарбаў. Чалавек без памяці – паталогія. Такі ж хворы і народ, які не ведае свайго мінулага, страціў гістарычную памяць. Народ без такой памяці не мае будучыні. Ён раней ці пазней знікае сярод больш згуртаваных суседзяў. Таму так важна ведаць, адкуль мы на гэтай зямлі, які адолелі шлях, калі перамагалі і дзе памыляліся, каб вопыт продкаў як паходня асвятляў нам кірунак у будучыню.

Любоў да Радзімы не з’яўляецца, аднак, вынікам атрыманых ведаў; хутчэй імкненне да ведаў ёсць вынік любові да Радзімы. Менавіта любоўю да Радзімы дыктуецца жаданне прасякаць загадкі даўніны, даведвацца пра тое, што было, але чаго ўжо няма, ці што засталося малапрыкметнымі слядамі ў скупых словах летапісаў і нешматлікіх дакументах, што зацерлася гужам стагоддзяў, зацягнулася глухімі туманамі мінулых эпох.



***Докшыцы з вышыні птушынага палёту***

Не заўсёды мінулае паказваецца ў яўных прыкметах, як, напрыклад, у помніках матэрыяльнай культуры; у духоўнай спадчыне больш складана разглядзець далёкае і цяперашняе – тут напластаванні часоў знітоўваюцца і набываюць цэласнасць. Каб іх распазнаць, неабходна ведаць гісторыю ідэй і свядомасці, іх ператварэнні і няпростае існаванне ў шэрагу палітычных і жыццёвых укладаў.

І ўсё ж, любоў да Бацькаўшчыны пачынаецца з любві да маці, мовы, з любві да таго куточка, дзе ты нарадзіўся, вучыўся, адкуль пайшоў у свет. Нараджаюцца людзі, вершы, вёскі, гарады. Адлічваюць гады, стагоддзі…

Докшыцы. Невялікі гарадок, раённы цэнтр. За гэтымі скупымі радкамі – гісторыя… Што мы пра яе ведаем?

Адказаць на гэта пытанне і ставіць перад сабой новы зборнік метадычных рэкамендацый па правядзенню паходаў і экскурсій па Докшыцкаму краю. “Па вуліцах роднага горада” – гэта чацвёрты выпуск метадычных рэкамендацый, якія прысвечаны Докшыцам. У ім змешчаны асноўныя версіі ўзнікнення назвы нашага горада, дадзена кароткая даведка па яго гісторыі. У гэтым зборніку не ставілася мэтай прапанаваць нейкую канкрэтную экскурсію. Кожны кіраўнік аб’яднання па інтарэсах, класны кіраўнік, альбо любы настаўнік ці выхавацель, выкарыстоўваючы ніжэй размешчаны матэрыял, зможа сам скласці маршрут сваёй экскурсіі, ўлічваючы ўзрост сваіх экскурсантаў, а таксама выбраць пэўную тэму.

Функцыі экскурсавода або гіда можа выконвае не толькі кіраўнік групы, але і самі ўдзельнікі экскурсіі. Для гэтага кіраўніку перад пачаткам падарожжа неабходна пазнаёміць вучняў з матэрыяламі дадзенага метадычнага зборніка альбо рэкамендаваць для знаёмства матэрыялы з іншых крыніц.

## *Авеяны легендамі…*

Докшыцы ніколі не займалі віднага месца ў гісторыі нашай дзяржавы. Таму звесткі пра яго вельмі скупыя, асабліва што датычыцца яго ранняга перыяду. Адсутнічае пэўная яснасць з часам заснавання горада, што даволі распаўсюджаная з’ява ў гісторыі, і з паходжаннем назвы нашага горада. Існуюць некалькі версій, якія тлумачаць адкуль пайшла назва “Докшыцы”. Разам з версіямі, якія прэтэндуюць на аб’ектыўнасць і навуковасць, існуюць і тыя, якія тлумачаць паходжанне тапоніма на ўзроўні звычайнага ўсведамлення.

Менавіта да апошняга адносяцца спробы растлумачыць назву горада ад слова “дошчачкі”, увязваючы яго з імператрыцай Кацярынай ІІ, якая сапраўды ехала, накіроўваючыся ў Крым праз тэрыторыю Беларусі, аднак зусім не праз Докшыцы. Пэўны сэнс, які зусім не адпавядае ісціне, ёсць у той версіі, якая сведчыць, што ў часы Вялікага княства Літоўскае на чале з князем прыехала будаваць горад у вытокаў Бярэзіны вялікая колькасць халопаў. У кожнага на шыі вісела невялікая дошчачка, на якой было напісана ці то прозвішча халопа, ці то імя яго гаспадара, ці то лічба. Справа была зроблена: горад пабудавалі і дарогі да яго вымасцілі. У знак прызнання заслуг усім халопам была падорана свабода. Радасныя рабы тут жа скідвалі з сябе ненавісныя дошчачкі, сімвалы іх залежнасці, і кідалі іх пад ногі. Халопаў было так многа, што ўся мясцовасць была літаральна ўсеяна гэтымі біркамі. Суседзі, якія першымі наведалі гэтыя мясціны, яшчэ доўга расказвалі аб убачаным, паўтараючы мноства разоў «Дощечки, дощечки, дощечки», што з часам трансфарміравалася ў Докшыцы. Ёсць логіка таксама і ў спробе звязаць назву горада з імем яго уладара магната Кішкі. У свой час суседі Докшыц, накіроўваючыся сюды на базар ці па другіх справах казалі, “Іду, еду да Кішкі”. Паступова прыназоўнік “да” злучыўся са словам “Кішкі”, а з цягам часу з’явілася і сучасная назва.

Не прэтэндуючы на навуковасць, аднак бяспрэчна цікавай з’яўляецца версія, якая выказана мясцовым краязнаўцам Александровічам у яго нататках, якія захоўваюцца ў складзе Радзівілаўскага архіва ў Дзяржархіве краіны ў Мінску. Яна арыгінальная, малавядомая, стала набыткам мясцовых краязнаўцаў зусім нядаўна. Вядома, што ў часы Вялікага княства Літоўскае на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIV стагоддзя рассяліліся татары, прыхільнікі

хана Тахтамыша. Тыя татары, якія пасяліліся ў нашым горадзе, зваліся “дакшытамі”. Яны былі адмысловымі гарбарамі і перш за ўсё маглі добра вырабляць сёдлы для коней. Вітаўтам было пастаўлена ім у абавязак шыць сёдлы для войска Вялікага княства Літоўскае. На самай справе татары жывуць у Докшыцах здаўна. І жывуць да цяперашняга часу. А вось ці далі яны назву нашаму гораду сцвярджаць цяжка.

У “Тлумачальным слоўніку” В.І.Даля ёсць слова “докшить”, што ўтварылася ў выніку некаторай паланізацыі слова “докстить” ад “докрестить”. Са словам “докшить” звязаны словы “докша” і “нядокша”, што азначае “хрышчоны” і “не хрышчоны”. Такім чынам можна меркаваць, што некалі тут пражывалі людзі, якія раней за іншых прынялі хрышчэнне, а наш горад быў як бы хрысціянскім востравам у моры суседняга язычніцтва. Калі гаварыць у адносінах да татараў, то хутчэй за ўсё яго жыхароў называлі нядокшамі. І тут гаворка можа ісці аб мусульманскім востраве ў хрысціянскім моры.

Цалкам верагодна, што “докша” і “нядокша” маглі стаць уласнымі імёнамі і даць імя іх пріхільнікам, нашчадкам, а таксама месцу іх пасялення.

Існуе і некалькі версій, звязаных з балцкай асновай назвы Докшыцы. У кароткім тапанімічным слоўнікуБеларусі ўказываецца першапачатковае значэнне асновы “doksne” – абноскі, лахманы. Некаторыя спецыялісты бачаць сувязь паміж такімі тапонімамі, як Дзяхцяры, Жары, Докшыцы, прымаючы пад увагу літоўскае “deqesys” – гар, папялішча.

Найбольш верагодная сувязь назвы горада з прозвішчам балцкага паходжання Докша. Дакшычане, докшыцы – гэта калектыўная назва людзе, якія былі звязаны з Докшай пэўнымі адносінамі, альбо лічыліся яго нашчадкамі ці з’яўляліся яго падданымі. Устаноўлена, што імя Докша паходзіць ад літоўскіх імён Даўгавыдас, Даўгвінас. Скарочаная форма гэтых імён Даўкша, Даўгша. Ад гэтых скарачэнняў верагодна ўтварыліся Докшы, Доніш, Докаш, Докашэнка, Докша. Ад Докшы – Докшыцы. Цалкам верагодна, што гэта назва зарадзілася яшчэ ў Крывіцкі перыяд станаўлення Полацкага княства, састаўной часткай якога была тэрыторыя Докшыцкага раёна. У IX – X стагоддзях у выніку зрушэння славянскіх плямёнаў крывічэй і балтаў і ўзнікла назва Докшыцы. Ад імя правадыра Докшы, нашчадкі якога Докшычы, Докшыцы.

## *З гістарычных крыніц…*

Аднак ці 600 гадоў Докшыцам? Магчыма, Докшыцы існуюць куды больш працяглы час. Колькі стагоддзяў маглі жыць людзі па-над вытокам Бярэзіны, не пакідаючы пасля сябе аніякіх пісьмовых звестак? Варта прыгледзецца да ўзвышша, што знаходзіцца каля вуліцы Горкага, на якім стаіць Дом рамёстваў. Адразу ж кінуцца ў вочы стромкія схілы пагорка. Падобна на гарадзішча. Аднак немагчыма даказаць гэта без правядзення археалагічных раскопак. Дарэчы, па словах настаўніка гісторыі Дзмітрыя Грабоўскага, гадоў пятнаццаць таму, калі капалі траншэю для водаправода на вуліцы Зарэчнай, у так званым "Царскім Сяле", знайшлі старажытную кераміку. Адзін са студэнтаў узяў некалькі яе кавалкаў і паказаў выкладчыку ва ўніверсітэце. Той датаваў яе Х – ХІ стагоддзем. Такім чынам, можна лічыць, што Докшыцам не 600, а як мінімум 1000 гадоў.

Пазнаёміўшыся з рознымі версіямі ўтварэння назвы горада і з навуковымі матэрыяламі, можна сказаць, што, як бы там не было, аднак няма сумненняў у тым, што ваколіцы Докшыц з'яўляліся раёнам пасялення крывічэй, якія, у сваю чаргу, сутыкнуліся з плямёнамі балтаў. Апошнія з цягам часу славяназаваліся і паступова выцясняліся ў Прыбалтыку. Можна меркаваць, што ўжо ў пачатку 2-га тысячагоддзя на тэрыторыі існавала пасяленне.

Дакладная дата ўзнікнення Докшыц невядома. Гістарычныя крыніцы сведчаць, што засяленне горада пачалося ў XIV стагоддзі, а то і раней. Тэрыторыя раёна, якая ўваходзіла ў склад Полацкага княства, паступова, у выніку драблення ўдзелаў аказваецца на мяжы Менскага і Полацкага княстваў. Калі ў XII стагоддзі са склада Менскага княства вылучылася Лагойскае княства, у яго павінна была ўваходзіць і сучасная Докшыччына.

Наш край ляжаў далёка ад цэнтраў княстваў і быў амаль поўнасцю пакрыты густымі лясамі, сярод якіх сустракаліся рэдкія пасяленні. У XIV стагоддзі тэрыторыя сучаснага Докшыцкага раёна увайшла ў склад Вялікага княства Літоўскае. З 1413 года Докшыччына ўваходзіла ў склад Віленскага ваяводства, якое дзялілася на некалькі валасцей. Амаль увесь сучасны Докшыцкі раён з памежнымі часткамі Лагойскага і Барысаўскага раёнаў утварылі Харэцкую воласць, якая ўпамінаецца ў шэрагу дакументаў канца XIV – пачатку XV стагоддзяў. Дакументы захавалі назвы некаторых пасяленняў – цэнтраў сельскіх абшчын: Беразіно, Ваўча, Гняздзілава, Дамашкавічы, Докшыцы.

У XV стагоддзі Докшыцы становяцца мястэчкам, гэта значыць пункт, які займае сярэдняе палажэнне паміж горадам і сялом (ні сяло, ні горад). У XVI стагоддзі Докшыцы адносяцца да ўладанняў вядомых магнатаў Кішкаў.

Ёсць звесткі, што ў 1514 годзе ў Докшыцах была пабудавана царква на даходы вядомага князя Канстанціна Астрожскага, пераможцы рускіх войск па Оршай у 1514 годзе. А з 1569 года Докшыцы ўвайшлі ў склад Рэчы Паспалітай.

У 1608 годзе епіскапам Станіславам Кішкай тут будуецца касцёл, а па некаторых звестках манастыр. На ўтрыманне касцёла ён назначыў фальварак Туркі, які меў на той час 12 дамоў крэпасных, а свяшчэннаслужыцеляў абавязаў утрымліваць невялікую школу і настаўніка. 19 студзеня 1609 года кароль Рэчы Паспалітай Сігізмунд III на вальным сейме ў Варшаве зацвердзіў гэту прывелею.

У палавіне XVII стагоддзя Докшыцы былі занятыя рускімі войскамі, а затым пераходзілі то да шведаў, то да палякаў, пакуль у 1708 годзе не былі разрабаваныя і спаленыя шведамі. Пры гэтым згарэў і касцёл, які знаходзіўся ў такім стане некалькі дзесяткаў гадоў. І вось ксёндз Міхаіл Фёдаравіч, закупіўшы драўніну ў вітуніцкіх і станькарольскіх лясах, у 1745 годзе адбудоўвае новы касцёл. У 1773 годзе касцёл быў асвеўаны і ў тым жа годзе ксёндз Сымон Трацэўскі размясціў у ім дадатковыя ўпрыгожванні. Каля касцюла сталі праводзіць ярмаркі. Пры ім нават існавала братэрства святой Тройцы, якое дазволіў у 1781 годзе сам папа Пій VI. Пры касцёле было тры званы. Самы вялікі, без подпісу, па паданнях, адліты самім заснавальнікам касцёла. На двух друхіх званах меліся подпісы. На адным – “Ян Сгалкоўскі грамадзянін докшыцкі звон гэты набыў на славу ў 1755 годзе”. На другім подпіс была на латыні “Міхаіл Фёдаравіч 1743 год”.

У 1786 годзе, за шэсць год да ўваходжання ў склад Расіі, у правабярэжнай частцы Докшыц пражывала 411 чалавек. У 1795 годзе ў Докшыцах жыло 500 чалавек. Тады яшчэ большасць насельніцтва горада складалі хрысціяне. Паводле надпісу на плане Докшыц, складзеным расійскай адміністрацыяй ў апошнія гады XVIII стагоддзя, габрэяў было 48 жанчын і 37 мужчын – усяго 85 чалавек. Аднак у 1794 годзе Кацярына II прыняла закон аб “мяжы габрэйскай аселасці”, які забараняў габрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мястэчак. Габрэі сталі перасяляцца ў гарады. Такім чынам усяго за некалькі гадоў колькасць жыхароў Докшыц павялічылася на некалькі соцень чалавек.

У выніку 2-га падзела Рэчы Паспалітай у 1793 годзе Докшыцы і ваколіцы ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Прагуляла і пракрычала шляхта сваю дзяржаву. На аснове заснаванняў аб губерніях Докшыцы былі назначаны ўездным горадам Мінскай губерні. Паступіў найвышэйшы наказ прысвоіць новым павятовым гарадам, у тым ліку і Докшыцам, усе правы і прывілеі, якія дараваліся граматай ад 21 красавіка 1785 года. Адпаведна ўказу ў Докшыцах у даволі спрошчаным выглядзе дзейнічалі некаторыя шматлікія ўстановы гарадскога самакіравання, і ў першую чаргу магістрат. На яго былі ўскладзены адміністратыўныя, судовыя і праваабарончыя функцыі, а таксама рашэнне пытанняў добраўпарадкавання горада. Магістрат пачаў работу каля 1796 года і праіснаваў да 1866 года.

22 студзеня 1796 года Сенат выдаў указ, які зацвердзіў герб горада, як неабходны атрыбут павятовага горада. У адпаведнасці з указам герб Докшыц прадстаўляў наступную выяву: “У зялёным полі, унізу шчыта па вуглах 2 натуральнага колеру ўзгоркі адпаведна сапраўднаму палажэнню акругі, з

узгоркаў выліваюцца 2 крыніцы, пазначаныя срэбрам; і складаюць рэкі, які цякуць у розныя бакі: гэта рэкі Вілія і Бярэзіна, якія злучаюць у гандлёвых адносінах Балтыйскае і Чорнае моры”.

Аднак прайшло менш чым год і выйшаў новы ўказ ад 12 снежня 1796 года, па выніках якога 4 паветы Мінскай губерні, у тым ліку і Докшыцкі, былі скасаваныя. Тэрыторыя Докшыцкага павета была раздзелена паміж Барысаўскім і Вілейскім паветамі Мінскай і Віленскай губернямі. Докшыцы, у адпаведнасці з праведзенымі пераразмеркаваннямі губернскіх тэрыторый, былі выведзены за штат і апынуліся ў складзе Барысаўскага павета. У той жа час паўночна-заходняя частка горада, якая знаходзілася за ракой Бярэзінай, была аднесена да Дісненскага павета Віленскай губерні.

У першай палове XIX стагоддзя Докшыцы былі другім па колькасці жыхароў населенным пунктам Барысаўскага павета, у тым ліку пераўзыходзіў Лагойск, які таксама адносіўся ў той час да Барысаўскага павета.

У 1800 годзе насельніцтва абодвух частак Докшыц складала 1118 чалавек. Тады ў Докшыцах было 152 двары, з якіх – 65 хрысціянскіх і 89 габрэйскіх. Пры гэтым большасць габрэяў жылі ў правабярэжжы, дзе яны засялялі 71 двор. Пераважная частка габрэяў жылі на вуліцы Дзікай, сённяшняй Інтэрнацыянальнай. Габрэі ўжо ў канцы XVIII стагоддзя стварылі тут сваю школу (паводле іншых звестак, нават дзве). Ужо ў 1865 годзе ў Докшыцах былі чатыры іўдзейскія малітоўныя дамы.

У 1812 годзе Докшыцы чакалі новыя выпрабаванні. Жыхары горада і ваколіц былі ў ліку тых тысяч людзей, якіх сабралі для будавання абарончых умацаванняў на 20 тысяч салдат на подступах да Барысава, а таксама выплачвалі грошы на іх збудаванне. Гэтыя ўмацаванні абаранялі маскоўскі накірунак. Работы па іх збудаванню пачаліся ў 1811 годзе, а завяршыліся вясной 1812 года.

Праз Докшыцы праходзіў корпус Яўгенія Багарнэ (віцэ-караля Італіі, пасынка Напалеона, сына вядомай Джозэфіны Багарнэ). Для патрэб французкай арміі ў горадзе быў абсталяваны шпіталь на 100 коек, выдзелены неабходныя лекі, харчаванне. У адпаведнасці з загадамі Напалеона для забеспячэння арміі праводзіўся збор харчавання і фуража. У Докшыцах быў утвораны пастаянны склад харчавання. Тым не менш, у 1812 годзе Докшыцы былі спалены. Аб гэтым сведчыць і малюнак французскага мастака А. Адама “Пажар у Докшыцах”.



Расійска-французская вайна 1812 года выклікала змяншэнне колькасці насельніцтва. У 1821 годзе ў Докшыцах было 180 двароў. У 1825 годзе насельніцтва Докшыц складала 898 чалавек. Напачатку 1830-х гадоў да Докшыц далучана Докшыцкая Слабада. Да 1833 года колькасць насельніцтва правабярэжнай часткі горада ўзрасла да 891 чалавека, у 1835 годзе было ўжо

916 чалавек, з якіх 686 – яўрэі, і 196 двароў. У 1851 годзе колькасць насельніцтва горада склала ўжо 1624 чалавекі. У 1860 годзе ў Докшыцах (без Слабады) пражывалі 1384 жыхары: 309 праваслаўных, 225 каталікаў, 790 іўдзеяў. Праз пяць гадоў, у 1865 годзе, колькасць насельніцтва (са Слабадой) склала ўжо 1836 чалавек: 635 праваслаўных, 521 каталік, 680 іўдзеяў.

Па апісанню Я. Тышкевіча: “…жители окрестностей Докшиц совершенно отличаются одеждой. Мужская одежда состоит из свиты шерстяной до колен, коричневого цвета, на ней насов белый, полотняный, по верху подпояснный ремнём, называемым дягой, под которым висит калита. Наговицы (штаны) серые или полотняные. Лапти, обувь в виде ботинок, плетёные из лыка чаще всего из липового, покрывают ногу от ступни до колена, обёрнутую полотном, как зимой, так и летом. Ворот у них расстегнут, рубаха, застёгнутая блестящей застёжкой, прикрывает шею.

Женщины носят на голове наметки, т.е. обвязывают голову белым полотном, старательно завязанным и чистым, капот шерстяной коричневого цвета и насов без ремня. Андаран (юбка шерстяная, цветная) носят женщины, имеющие возможность, более бедные полотняную и сверху передник. На ногах чаще всего ботинки, иногда лапти. Девчата все в белом, на голове белые платки, из-под которых свисают косы, бусы, шнуровка цветная и застёжка блестящая.

Жители полей имеют с земли весь свой доход, занимаются перевозками по суше, уходят далека в заработки в Петербург, Москву, Варшаву. Дома обычно чистые, хорошо содержатся, везде заборы и ограды сохраняются постоянно. Для отопления всегда имеется запас дров, которые всегда аккуратно уложены и расходуются по мере надобности. Сельскохозяйственный инвентарь и телеги старательно сохраняются потому, что приобретение древесины стоит им денег, которые могут получить только тяжёлой своей работой. Земля сама по себе более урожайная, чем в лесных местах, при меньших затратах труда даёт большие урожаи, зато каждый неурожайный год для них страшен, поскольку они не имеют других источников доходов в жизни, кроме земли”,



***Докшыцы на карце 200 год таму…***

У Докшыцах 200 гадоў таму былі часткова забудаваныя сённяшнія вуліцы Савецкая (дзесьці да паварота на Падомхі), Горкага (да месца, дзе сёння крама “Юбілейная”), Пушкіна (да старых могілак, дзе зараз касцёл), Ленінская (да перасячэння з вуліцай Міцкевіча), Інтэрнацыянальная. Па некалькі пабудоў было на вуліцах Ветранай (Гайдара), Татарскай (Дзяржынскага). На галоўнай гандлёвай плошчы (сённяшняй Палявога), стаяў каталіцкі касцёл. За касцёлам была плябанія. Побач на плошчы стаяў

адзіны ў Докшыцах мураваны будынак, які захаваўся і сёння ў змененым выглядзе. Сядзіба, якая належала жамойцкай капітуле, а пазней стала ўласнасцю Мілашэвіча, размяшчалася на ўсход ад цэнтра, пры вуліцы Полацкай (Горкага). На левым баку гэтай вуліцы стаяла ўніяцкая царква. Другі ўніяцкі храм быў на вуліцы Глыбоцкай (Савецкай). На плане горада канца XVIII стагоддзя пазначана і дарога, што ішла пры сённяшняй вуліцы Міцкевіча. Тады ўздоўж яе стаялі гумны местачкоўцаў. У адным з дакументаў 1892 года гэтая вуліца згадваецца як Гуменная лінія.

Калі паглядзець на тапаграфічную карту канца 1860-х гадоў, можна прасачыць, што змянілася ў Докшыцах за першую палову XIX стагоддзя. Пачалі забудоўвацца вуліцы Міцкевіча, Дзяржынскага, 1 Мая і Падгорная. На карце 1916 годзе мы ўжо бачым забудову на вуліцы Піянерскай.

У 60-я гады XIX стагоддзя ў Докшыцах дзейнічалі дзве фабрыкі (хутчэй кустарныя промыслы), адна піваварня, паравы млын. У той жа час у горадзе налічвалася 17 шынкаў і 22 часовых драўляных ларкоў. Кожны аўторак праходзіла ярмарка.



*Сінагога ў Докшыцах*

У 1897 годзе ў горадзе налічвалася 3650 жыхароў, большая частка каторых была яўрэйскай нацыянальнасці. У іх руках знаходзіўся гандаль збожжам, лесам, соллю і г.д. Гарадскі прыбытак складаў больш за 2 тысячы рублёў.

У пачатку XX стагоддзя ў Докшыцах ужо існавалі дзве царквы, адзін касцёл, тры сінагогі, школа. Дзейнічалі валасное праўленне і другія дзяржаўныя ўстановы, грамадскія аб’яднанні, у тым ліку грамадскае аб’яднанне аматараў выяўленчага мастацтва і музыкі. На ўсю губерню славілася Докшыцкая батлейка Патупчыка. Насельніцтва горада ў 1914 годзе складала каля пяці тысяч жыхароў. Вядома таксама, што летам 1907 года ў Докшыцах адбыўся з’езд Беларускай сацыялістычнай грамады, які прыняў рашэнне аб роспуску партыі.

У верасні 1915 года, пасля “Свянцянскага прарыву”, нямецкія акупанты дасягнулі Докшыц. У баях загінулі некалькі расійскіх салдатаў, якія былі пахаваныя на праваслаўных могілках у Докшыцах. Аднак хутка Докшыцы зноў былі заняты расійцамі. Яны збудавалі для патрэбаў фронту ваенна-палявую вузкакалейку Барысаў – Докшыцы – Параф’янава. Каля Докшыц быў узведзены і вайсковы аэрадром. У 1917 годзе адбылася рэвалюцыя, і ўладу ўзялі бальшавікі. Яны забаранілі працу гарадскога магістрата, знішчылі помнік імператару Аляксандру II, памешчыка Венцлавовіча, уладальніка маёнтка Норвідполле, расстралялі як “эксплуататара”. У лютым 1918 года Докшыцы былі захоплены немцамі, у лістападзе ж сюды вярнуліся бальшавікі. У той час дзеці аднаго з настаўнікаў, забаўляючыся, падпалілі порах. Вецер разнёс полымя, і ў выніку згарэла значная частка горада. Потым

Докшыцы некалькі разоў пераходзілі то ў рукі палякаў, то бальшавікоў. На каталіцкіх могілках захаваліся пахаванні польскіх жаўнераў з той вайны.

У жніўні 1919 года пасля бою Докшыцы былі захоплены палякамі. Зноў разбураны. 5 ліпеня 1920 года ў горад увайшла Чырвоная Армія. Аднак па Рыжскаму дагавору 1921 года Докшыцы ўвайшлі ў склад Польшчы, дзе знаходзіліся да 17 верасня 1939 года. У гэты час Докшыцы былі ў складзе Віленскага ваяводства Дісненскага павета і з'яўляліся цэнтрам гміны, самай малой адзінкай тагачаснага тэрытарыяльнага дзялення Польшчы. Тут працавала пачатковая народная ўсеагульная школа трэцяй ступені (з сямігадовым тэрмінам навучання).

У часы Другой Рэчы Паспалітай Докшыцы сталі цэнтрам гміны Дунілавіцкага, а з 1925 года Дзісненскага павета Віленскага ваяводства. Горад працягваў расці і развівацца. Насельніцтва Докшыц склала ў 1930 годзе 4106 чалавек, з якіх пераважную большасць складалі, як і ў часы Расійскай імперыі, габрэі. Дзякуючы габрэям, у Докшыцах развівалася прамысловасць і гандаль.

У Докшыцах былі тры млыны з лесапілкамі. Адзін з іх, з чырвонай цэглы, збудавала на вуліцы Горкага суполка "Шэйман С., Ёльк і Франкфурт". Ён захаваўся да сённяшняга часу. Яшчэ за часамі Расійскай імперыі габрэй-прадпрымальнік Шэйман пабудаваў млын на месцы сённяшняга хлебазавода, аднак пазней прадаў яго ўладальніку маёнтка Докшыцы Мікульскаму. Трэці млын быў у маёнтку Блонь Прушынскага, на месцы сённяшняй бальніцы. Там былі два лакамабілі, якія з 1928 года забяспечвалі электраэнергіяй Докшыцы. У Блоні выраблялiся зборныя шчытавыя домікі для дач, якія вазілі на продаж у Гдыню. Не страчваў сваёй вядомасці і піўзавод Гордана. Піва, якое выраблялася ў Докшыцах, у дубовых бочках вазілі прадаваць у Вільню і Варшаву.

Было і некалькі больш дробных прадпрыемстваў: цэх па перапрацоўцы малака (так званая "млечарня"), цэх па вырабу газаванай вады, дзве гарбарні, цагельня, мылаварня, некалькі льнотрапалак, бойня. У 1939 годзе ў Докшыцах было 106 прыватных крам, дзве гасцініцы, некалькі рэстаранаў і кавярняў, два банкі, некалькі аптэк, школа, клуб. У 1925-26 годзе была ўзведзена мячэць. У Докшыцах былі размешчаны вайсковыя часці КОП (Корпус Охроны Пограніча). Салдаты збудавалі ў горадзе стадыён, стрэльбішча, стварылі вадаём на Бярэзіне. У 1920-я гады быў пастаўлены помнік Пілсудскаму, каля якога ў святочныя дні стаяла ганаровая варта. Сённяшняя вуліца Ленінская насіла імя Пілсудскага. На Дзень незалежнасці і Дзень канстытуцыі праводзіліся ўрачыстыя шэсці. Большасць гарадскіх вуліц былі брукаванымі, а цэнтральныя вуліцы асвятляліся ўначы.

Раніцай 17 верасня 1939 года ў Докшыцы ўвайшлі савецкія танкі. Былыя камуністы-падпольшчыкі і многія габрэі сустракалі іх з хлебам-соллю і кідалі на танкі кветкі. Большасць людзей верылі ў лепшае. Ды лепшае не наступіла. Новыя ўлады арыштавалі былую адміністрацыю (не пашкадавалі

нават вартаўніка магістрата), паліцыю, салдатаў КОП, пацярпела шмат нявінных людзей.

4 снежня 1939 года была ўтворана Вілейская вобласць, у склад якой і увайшлі Докшыцы (Дісненскі павет). А 15 студзеня 1940 года быў утвораны Докшыцкі раён.



22 чэрвеня 1941 года, у поўдзень, у гарадскім клубе было афіцыйна абвешчана аб пачатку новай вайны. Назаўтра адбыўся першы налёт авіяцыі. 2 ліпеня ў Докшыцы ўвайшлі немцы. Яны ў першы ж дзень расстралялі трох чалавек. У ліпені немцы размясцілі ў Докшыцах лагер ваеннапалонных, а ў верасні было створана гета. Гета “ліквідавалі” 29 траўня 1942 года. Немцы закатавалі 2653 габрэяў, якія пахаваныя ў пясчаным кар’еры пры вуліцы Маякоўскага. Усяго ж у тым кар’еры знайшлі свой апошні прытулак каля 4200 чалавек.



*Аднаўленныя яўрэйскія могілкі*

У лютым 1943 года Докшыцы некалькі разоў падвяргаліся абстрэлам партызанаў. Тады ж яны напалі на маёнтак Блонь і спалілі яго. 4 траўня партызаны напалі на Докшыцы, спалілі млын, “млечарню” і 6 дамоў. 17 жніўня 1943 года вайскоўцы 1-й Рускай Вызваленчай арміі (“радзівонаўцы”), якія дыслакаваліся ў Докшыцах, перайшлі на бок партызанаў. Яны разграмілі нямецкі гарнізон у горадзе і пайшлі на чыгуначны вузел Крулеўшчына. У Докшыцах жа амаль суткі “гаспадарылі” партызаны брыгады “Жалязняк”. Яны разрабавалі тое, што засталося ад немцаў і спалілі горад. У агні знішчаны амаль усе грамадскія будынкі і прадпрыемствы Докшыц. Пасля вайны ўсё спісалі на немцаў. Зрэшты, і немцы пры адступленні таксама палілі ў горадзе тое, што засталося цэлым пасля партызанаў. Пасля вызвалення Докшыц 2 ліпеня 1944 года раённыя установы давялося размясціць на станцыі Параф’янава, бо ў спаленым горадзе не было прыдатных будынкаў.

# *Экскурсія па гораду Докшыцы*

Агінаючы лясы, скрось лугі, прабягаючы міма невялікіх вёсачак, важных гарадоў з дамамі-веліканамі, міма ціхіх пасёлкаў бягуць дарогі. Яны, нібы людзі, спяшаюцца некуды, сустракаюцца і расходзяцца ў розныя бакі, і ўсе куды-небудзь прыводзяць.




Адна з такіх дарог, бегучы праз лес, вядзе да ўказальніка з выявай герба і надпісам “Докшыцы”, а за ім рассыпаецца на вуліцы, перавулкі, завулачкі…

Знаёмцеся, Докшыцы – наш родны горад, горад, дзе прайшло дзяцінства вашых бацькоў, горад, які мы любім і якім ганарымся. Ён не падобны ні на які іншы. Не выхваляецца раскошай і не ззяе мільёнамі неонавых агнёў, не вылучаецца асаблівымі будынкамі. Тут няма шумных патокаў машын і людзей. Ён ціхі і спакойны, усё такі ж, якім мы яго ведаем.

Пройдземся па вуліцах горада. Большасць з іх нагадвае ціхія вясковыя вулачкі, па абодва бакі якіх стаяць хаты, акружаныя садкамі і кветнікамі. Тут асабліва прыгожа вясной, калі сады ў квецені. Ідзеш, а пад ногі асыпаецца бела-ружовы снег пялёсткаў. Побач стаяць дамы веліканы, якія глядзяць на ўсё і на ўсіх зверху ўніз, быццам падкрэсліваючы сваю перавагу.

Зараз мы з вамі знаходзімся на беразе Докшыцкага возера, якое было ўтворана пасля пабудовы праз раку Бярэзіна дамбы.

Сам жа горад упершыню ўпамінаецца ў грамаце вялікага князя Вялікага княства Літоўскае Вітаўта, выдадзенай 13 студзеня 1407 года ў Вільні. У ёй Манівід атрымаў пацвярджэнне на сёлы і сялян-даннікаў у Харэцкай воласці, сярод якіх названы даннікі “доксычане” (doxyczane). У 1621 годзе Докшыцы атрымалі статус мястэчка, а ў 1795 годзе Докшыцы атрымалі Магдэбургскае права і сталі горадам. А яшчэ праз год за Докшыцамі быў замацаваны ўласны герб.

***А цяпер давайце ўспомнім легенды аб паходжанні назвы нашага горада.***



А вы ведаеце, што раней рака з’яўлялася граніцай – на правым беразе была Мінская губерня Барысаўскі павет, на левым беразе пачыналася Віленская губерня. Па словах старых людзей па краю дарогі і ракі раслі вербы, палова з якіх “плакала” у ваду, а другая згіналася над дарогай. На рацэ было калісьці аж тры млыны і вада была чыстая і празрыстая. А вясной Бярэзіна пацягвалася пасля зімовага сну, разгортвалася так, што затаплівала дамы на Глыбоцкай вуліцы, так як дарога ішла метры на два ніжэй, чым зараз. А аднаго году так разлілася, што

змыла адзін з вадзяных млыноў. Пасля гэтага польскімі жаўнерамі тут была створана запруда і утварылася невялікае возера.



***Паводка ў Докшыцах. 1931 год.***

Чаму вуліца называлася **Глыбоцкай** не цяжка здагадацца. Раней некаторыя вуліцы ў многіх гарадах часта называлі ў залежнасці ад яе накірунку. Так, вуліца на Глыбокае атрымала назву Глыбоцкая, на Полацк – Полацкая, на Даўгінава – Даўгінаўская, а на Барысаў – Барысаўская. Глыбоцкай яна стала называцца ў 1940 годзе. А яшчэ ў часы Другой Рэчы Паспалітай яна насіла назву Віленская. У час нямецкай акупацыі яна была Вільноштрассэ. Яна мела такую ж даўжыню як і зараз, і была брукаванай. На гэтай вуліцы жыло шмат яўрэяў. Пры павароце на Параф'янава быў, так званы конны базар, дзе кожны аўторак адбываўся гандаль жывёлай.

У самым канцы вуліцы, на пагорку стаяў дом дарожнага майстра, а на месцы цяперашняй АЗС – льнотрапалка яўрэя Маркмана, пра якога мы раскажам крыху пазней. На месцы сённяшняга хлебазавода стаяў каменны млын з лесапілкай, які спачатку належаў Шэйману, пазней прададзены Мікульскаму. Шэйман разам з яўрэям Франкфуртам стварыў суполку "Шэйман С., Ёльк і Франкфурт" і збудаваў новы млын на вуліцы Полацкай.



***Сям'я Франкфурта***

Безумоўным упрыгажэннем вуліцы быў маёнтак пані Мікульскай. Драўляны дом з мезанінам быў акружаны ліпавымі алеямі, клумбамі кветак, меўся вялікі сад, дагледжаная сажалка. Пасля вайны ў панскіх будынках размясцілася МТС, а потым райсельгастэхніка. Зараз аб былым маёнтку нагадваюць толькі некалькі старых ліп і адзіны будынак.

Сваё аблічча – ужо вуліца Савецкая – істотна змяніла пасля 1966 года. Менавіта тады тут пачалася рэканструкцыя. Было пашырана возера, пабудавана дамба і мост, падняты насып, пасаджаны парк.

А вось каля нас праходзіць вуліца **Дзяржынскага.** Старадаўняя назва гэтай вуліцы – Татарская – зусім не выпадковая. Яна сведчыць аб тым, што на ёй у пераважнай большасці жылі прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці. Гэта былі нашчадкі тых татараў, якіх 600 год таму князь Вітаўт запрасіў на службу. У XX стагоддзі татары займаліся толькі рамёствамі. У Докшыцах яны ў большасці сваёй апрацоўвалі шкуры. Для гэтай



***Вуліца Дзяржынскага***

справы патрэбна многа вады, таму рамеснікі і пасяліліся ля возера, а потым рассяліліся і па іншых вуліцах. Да вайны татары жылі яшчэ сваім нацыянальным асяродкам: захоўвалі мусульманскія звычаі, мову, веравызнанне. Зараз на вуліцы з прадстаўнікоў татарскай нацыянальнасці значацца дзве сям'і Радкевічаў.

***Аднак давайце пяройдзем на плошчу Палявога.***



Базарная плошча, а зараз **плошча Палявога**, тады была цэнтрам гарадскога жыцця. Як і ва ўсе часы плошчу ўпрыгожваў драўляны касцёл. Ён знаходзіўся на месцы, дзе стаіць цяпер Музычная школа. Яе пабудавалі пасля таго, як касцёл быў спалены. Каля касцёла стаяў самы стары мураваны будынак горада. Ён захаваўся да цяперашняга часу. У ім былі дзве крамы, што гандлявалі тэкстылем. У падвале быў цэх па вырабу газаванай вады і напояў. Кожны аўторак на плошчы быў кірмаш. Акрамя таго, на плошчы былі чатыры гандлёвыя рады, у кожным з якіх было па восем крамаў. Плошча была шчыльна забудаваная з усіх бакоў, тут былі і іншыя гандлёвыя кропкі, у прыватнасці, два кніжна-газетныя кіёскі акцыянернага таварыства "Рух". З заходняга боку плошчы, дзе зараз знаходзіцца кантора райспажыўсаюза, тады знаходзіўся заездны двор. На плошчы знаходзіўся і гатэль, які належаў сястрэ аднаго яўрэя Маркмана. Сам Маркман быў даволі значным па мясцовых мерках прадпрымальнікам і валодаў у Докшыцах крамай па продажу тканіны. Жыў ён у мураваным доме, дзе зараз знаходзіцца крама № 3 "Сельмаг".



*Пачатак XX ст.*



*Пачатак XXI ст.*



*"Сельмаг"*



*Сям'я Маркман*

У гады Вялікай Айчыннай вайны на гэтай плошчы гітлераўцы вешалі мясцовых жыхароў.

А Палявой плошчу назвалі пасля таго, як тут зрабілі брацкую магілу, у якой разам з іншымі жыхарамі, партызанамі і вайскоўцамі быў пахаваны Герой Савецкага Саюза Іван Сцяпанавіч Палявы.

*Ён нарадзіўся ў 1907 годзе ў сяле Новамікалаеўка на Украіне. Здзейсніў 125 баявых вылетаў вядучым звяна, авіяэскадрыллі, палка на дальнюю стратэгічную разведку, бамбардзіроўку войск праціўніка.*



*Але 20 жніўня 1944 года адбыўся яго апошні палёт. Лётчык Іван Сцяпанавіч Палявы, штурман Васіль Мікітавіч Ніцай і паветраны стралок-радыст старшы сяржант С.А.Шумкоў – загінулі. У гэты дзень з малажанскага аэрадрома яны паляцелі ў Прыбалтыку бамбіць матэрыяльныя базы ворага на буйным чыгуначным вузле горада Мажэйкяй. Адбамбіліся, здавалася, удала. Уся станцыя была ў агні пажараў і ўзрываў. Але варожая зенітная артылерыя таксама вяла агонь па нашых “Ту-2”. Самалёт Палявога быў падбіты, ішоў на адным маторы. Да аэрадрома Палявы яго ўсё ж давёў, ды ў час пасадкі “Ту-2” рэзка пайшоў уніз і ўрэзаўся ў зямлю. Выратаваць экіпаж было немагчыма.*

Экіпаж самалёта “Ту-2” пахаваны ў вёсцы Малажане на вясковых могілках. На магіле ўстаноўлены помнік.

Ад плошчы Палявога адыходзяць яшчэ тры вуліцы. Спачатку з вамі пазнаёмімся **з вуліцай Пушкіна (Даўгінаўскай).** У польскі час яна насіла назву Чвартакаў, у 1940 годзе пераіменавана ў гонар Варашылава, а з 1950-х гадоў носіць сучасную назву. Пачыналася яна пажарным дэпо, якое размяшчалася на месцы будынка старой гарадской лазні. Зараз тут упрыгожвае наваколле лазнева-аздараўленчы цэнтр. Пажарнае дэпо было знішчана ў 1943 годзе. У 1930-я гады ў Докшыцах існавала добраахвотніцкая пажарная каманда. Яе сябры не павінны былі плаціць страхоўку і мелі некаторыя падатковыя ільготы. Яны мелі сваю форму. У выпадку пажара кожны са сваім канём павінен быў з’явіцца ў пажарнае дэпо, запрагчы каня ў адну з павозак з бочкай вады, якія там пастаянна стаялі. Былі ў іх шэсць помпаў, мотапомпа, цэнтрабежка. Быў і аўтамабіль, але хутка пасля набыцця ён сапсаваўся і не рамантаваўся. Кожны год праводзілася свята пажарнікаў, на якое збіраліся пажарныя дружыны з усяго наваколля. Далей ва ўласным доме Кавалеўскіх працавала амбулаторыя, дзе бясплатна лячылі рабочых усіх прамысловых прадпрыемстваў горада.



***Пажарная брыгада ў Докшыцах***

Да сённяшніх дзён захаваўся адзіны будынак таго часу. Гэта дом яўрэйкі Рывы Элькі Хацкель, дзе зараз знаходзіцца крама рытуальных паслуг райста. Рыва трымала невялікую булачную, дзе выпякаліся смачныя булачкі, абаранкі. Добрая яўрэйка падгарэлую прадукцыю, здаралася, раздавала дзецям бедных гараджан. У канцы вуліцы, з правага боку знаходзіліся ўніяцкія могілкі, знішчаныя ў 60-я гады XX стагоддзя. Тут жа стаяла царква Іаана Багаслова, разабраная ў канцы XIX стагоддзя, і каталіцкая каплічка Святога Міхаіла, разбураная ў 1967 годзе. Зараз на гэтым месцы ўзвышаецца касцёл. За польскім часам у канцы вуліцы размяшчаліся казармы польскай пагранічнай часці.




*Дом Рывы Хацкель*

Касцёл у Докшыцах, як ужо гаварылася, быў збудаваны 400 гадоў таму – у 1608 годзе. Яго фундатарам быў Станіслаў Кішка. Ён жа абавязаў святароў утрымліваць школу ў мястэчку.

У 1655 годзе касцёл спалены маскоўскімі заваёўнікамі. Раней увесь час у гэтым вінавацілі шведаў і называлі датай знішчэння касцёла 1708 год. Аднак у матэрыялах візітацыі 1674 года, праведзенай біскупам Сліпскім, напісана: “касцёл агнём спалены”. Тым не менш, каталіцкая парафія існавала, а набажэнствы адпраўляліся ў стайні. Толькі ў 1745-53 гадах касцёл быў адбудаваны дзякуючы намаганням ксяндза Міхаіла Федаровіча. Дрэва для будоўлі было закуплена ў Вітуніцкіх і Станкарольскіх лясах на Бягомльшчыне. У 1753 годзе касцёл быў асвечаны біскупам Аляксандрам Гормінам. У тым жа годзе касцёл быў упрыгожаны ксяндзом Юры Карніловічам, а ў 1787 годзе яго адрамантаваў і ўпрыгожыў ксёндз Сымон Трацэўскі. У 1781 годзе пры касцёле было заснавана брацтва Найсвяцейшай Тройцы.

Ксёндз Сымон Трацэўскі напрыканцы XVIII – напачатку XIX стагоддзя збудаваў новы будынак для школы. У 1791 годзе гараджанка Марыяна Карнельская прызначыла 47 рублёў 20 капеек на ўтрыманне двух вучняў. Ксёндз Трацэўскі прызначыў яшчэ 30 рублёў на ўтрыманне трэцяга вучня, ён жа набыў для школы каля пяцідзесяці кніг. Паводле кнігі “Дыяцэзія Мінская каля 1830 года”, складзенай на падставе архіўных дакументаў, у школе напачатку XIX стагоддзя было шэсць вучняў. Пры касцёле быў таксама прытулак для састарэлых, якія ўтрымліваліся за кошт ахвяраванняў.



*Касцёл Найсвяцейшай Тройцы*
*Пачатак XX ст.*

У першай палове XIX стагоддзя касцёл быў перабудаваны. Спачатку ён меў дзве драўляныя вежы, а ў плане быў крыжападобным. У 1856 годзе ў апісанні

касцёла згадваецца “франтон на 6 акруглых слупах”, які выразна бачны на больш позніх фотаздымках. Здымкі сведчаць, што касцёл напрыканцы XIX стагоддзя быў прамавугольны ў плане. Шкада, няма пакуль што звестак, калі і кім быў перабудаваны касцёл. Але, магчыма, перабудова магла быць звязана з разбурэннем ці пашкоджаннем у час расійска-французскай вайны ў 1812 годзе.

У 1830-х гг., пасля задушэння нацыянальна-вызваленчага паўстання 1831 года, царскі ўрад пачаў прымаць меры, накіраваныя супраць Каталіцкага Касцёла. Канфіскоўвалася касцёльная маёмасць. У докшыцкага касцёла ў 1834 годзе былі адабраныя фальваркі Туркі і Сымонаўка. Школа ў Докшыцах таксама была адабраная дзяржавай ў 1834 годзе, і адразу зачынена. Улады не знайшлі сродкаў на яе ўтрыманне.

У XIX стагоддзі на тэрыторыі Докшыцкай каталіцкай парафіі былі капліцы ў Гняздзілаўскім Двары, Замошшы, Зашчэслі, філіяльныя касцёлы ў Дзедзіне і Камайску. Апошні праз некаторы час стаў парафіяльным. На могілках на месцы сённяшняга касцёла стаяла мураваная капліца Святога Міхала са склепам і адным алтаром.

Царскія ўлады працягвалі ціснуць на Касцёл, умешваючыся ў яго справы. У докшыцкім касцёле была ўведзена руская мова, адбываліся дадатковыя набажэнствы па расійскаму “трэбніку”, самавольнае ўвядзенне якога супярэчыла Касцельнаму Праву. За гэта ўлады шчодра плацілі. Так, у 1877 годзе ксёндз Гарбатоўскі ў Докшыцах у дадатак да гадавога заробку ў памеры 275 рублёў атрымліваў яшчэ 325 руб. за ўвядзенне “трэбніка” і пераклад набажэнстваў на рускую мову.



*Пробашч докшыцкага касцёла ў 1890-1900-я гг. кс. Ігнацi Радзівіл*

Аднак так было нядоўга. У канцы XIX стагоддзя пробашчам стаў ксёндз Іганцый Радзівіл, які служыў тут каля 30 гадоў. Яго мэтай сапраўды было служэнне Богу, а не прыслугоўванне царскім уладам. І цяпер плацілі не яму, а ён сам вымушаны быў некалькі разоў заплаціць штраф у памеры 100 рублёў за правядзенне працэсій вакол касцёла і за адмову ад рускамоўных набажэнстваў. Нездарма ж пра гэтага ксяндза напісана ў кнізе “Нашы касцёлы” (Варшава – Пецярбург, 1912-14 гг.): “Гэта сапраўдны айцец і апякун свайго люду, сапраўдны жаўнер Хрыстовы, і цяпер яшчэ стаіць на сваёй пасадзе, не надламаны шматгадовай надзвычайнай працай”. Ён жа адрамантаваў касцёл. Напачатку XX стагоддзя ў касцёле было 5 алтароў, 3 званы, а таксама часткі мошчаў Святой Юстыны, перавезеныя сюды з разабранага філіяльнага касцёла ў Дзедзіне.

Касцёл быў спалены партызанамі 17 жніўня 1943 года. “Ініцыятыву” ў яго знішчэнні праявіў адзін з жыхароў Докшыц, які канфліктаваў з ксяндзом за тое, што той у свой час не згадзіўся абвянчаць яго з сужыцелькай. Таму касцёл згарэў раней за ўсе астатнія будынкі горада. Вернікі ўратавалі

ксяндза, схаваўшы яго ад партызанаў. Званы з касцёла былі закапаныя ў зямлю. Два з іх ляжаць дзесьці паміж Докшыцамі і Чырвоным Беразіном, трэці ж – пад былым райкамам партыі (у свой час хтосьці казаў, што ў 1940-х гадах яго нібыта адкапалі і здалі на пераплаўку). У 1945 годзе на месцы спаленага касцёла была ўзведзена капліца. Аднак новая ўлада хутка разбурыла і яе ды пабудавала на месцы святыні райкам партыі.



Толькі 23 верасня 1991 года быў асвечаны вуглавы камень новага касцёла Найсвяцейшай Тройцы, які ўзведзены на пагорку па-над возерам пры вуліцы Пушкіна. Касцёл быў асвечаны 4 кастрычніка 1995 года.

Жылі на вуліцы мяшчане праваслаўнага і каталіцкага веравызнання. Стаяла некалькі яўрэйскіх хат. Сярод жыхароў было шмат выдатных майстроў. Вядомы былі шаўцы Мацкевічы. Рагулька рабіў калаўроты і сіта. Вылучалася сваёй адукаванасцю, мастацкімі здольнасцямі сям'я Вішнеўскіх, якія значацца і сёння сярод жыхароў вуліцы.

**Старажытная назва вуліцы М. Горкага (да 1939 года "Імя Касцюшкі") – "Полацкая".** Яе назва гаворыць сама за сябе. У час, калі не было сучасных аўтамагістралеў, у Мінск з Полацка ездзілі праз Докшыцы і Даўгінава. Таму вуліца была брукаваная і яе самым адметным месцам, без сумнення, лічыўся завод Гордана, дзе выраблялі піва, якое ведала на смак уся Польшча. Ён быў заснаваны ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Не грэбавала докшыцкім півам нават шляхетныя Варшава і Вільня. Піва туды на продаж вазілі ў дубовых бочках. Піўзавод меў некалькі будынкаў – саладоўню, піваварню і ляднік. Завод меў уласную эмблему – выяву рака, што трымае ў кляшні куфаль піва. У будынках стаялі вялізныя дубовыя чаны. Неяк адзін яўрэй захацеў паглядзець, колькі там піва, ды зваліўся і ўтапіўся. Каля піваварні была крыніца з вельмі чыстай вадой, якую выкарыстоўвалі для вытворчасці. У вайну завод быў спалены, а рэцэпты піва незваротна згублены. Зараз каля гэтага месца знаходзіцца адміністрацыйны будынак аддзела будаўніцтва і архітэктуры райвыканкома. Напачатку 1920-х гадоў у Гордана згадваецца тартак, аднак пазней ён ужо не існаваў.

На месцы сённяшняй крамы "Юбілейная" працавала маслабойня, якраз яна і была папярэднікам малаказавода. А каля паварота на Лапуты стаялі каталіцкі і праваслаўны крыжы. Буйной вытворчасцю для горада з'яўляўся млын Шэймана і Франкфурта, дзе выраблялі петляваную муку, крупы, рэзалі лес, валялі сукно. Пасля вайны тут стварылі прамкамбінат.

На вуліцы Полацкай знаходзілася царква Іаана Багаслова, перанесеная сюды з могілак па вуліцы Даўгінаўскай у 1906 годзе. Яна праіснавала да пачатку 60-х гадоў. Зараз гэта адзін з будынкаў Дома рамёстваў. Побач з ёй быў дом вядомага свяшчэнніка Мікалая Пляшчынскага, які ўзначальваў Докшыцкі прыход амаль паўстагоддзя. На іншым баку вуліцы стаяў будынак праўлення гміны. Побач з ёй была мясцовая турма, дзе адбывалі пакаранне арыштаваныя за адміністрацыйныя правапарушэнні



*Царква Св. Іаана Багаслова (Дом рамёстваў)*



*Царква Св. Іаана Багаслова Фота 1930-х г. (здымак з архіву Мікалая Чысцякова)*

Заканчвалася вуліца фальваркам пана Прушынскага "Блонь". У ім таксама існаваў млын з дзвюма піларамамі. Млын уяўляў сабой вялізны будынак з белай цэглы. Там выраблялiся шчытавыя домікі для лецішчаў, якія потым збіраліся на ўзбярэжжы Балтыйскага мора каля Гдыні і там прадаваліся. У 1928 годзе быў пастаўлены генератар, які даваў электрычнасць не толькі ў маёнтак, але і ў горад. Аднак з-за высокага кошту электрычнасць была недаступнай для большасці гараджан. У 1930-я гады згарэў сядзібны дом і пазней ён не адбудоўваўся. Млын з электрастанцыяй спалілі ў лютым 1943 года. Яшчэ ў гады вайны немцы размясцілі ў фальварку бальніцу. З таго часу яна там так і засталася. Цяпер гэта вуліца забудавана, у асноўным, прыватнымі жылымі дамамі. На ёй знаходзіцца адміністрацыйны будынак аддзела будаўніцтва і архітэктуры райвыканкома, працуе некалькі прыватных крам і крама райспа. Адзін са старадаўніх будынкаў, якія належыў некалі Гордану, пераабсталяваны пад камп'ютарны клуб. Жыве на вуліцы больш за 100 чалавек.



*Адзін з будынкаў Гордана*

Прадоўжым нашу экскурсію. Паварочваем на **вуліцу Ленінская.** Гэтая вуліца ў часы Расійскай Імперыі насіла назву Аляксандраўская, у часы Другой Рэчы Паспалітай – Пілсудскага. Тым не менш, у даваенны час гараджане заўсёды называлі яе Барысаўскай.

На ўчастку ад "Беларусбанка" да Полацкай вуліцы знаходзілася шмат розных устаноў. Акрамя жылых дамоў тут знаходзіліся крама Мышкоўскага,

рэстаран Клёнскага, крама тэкстылю Каганера. Перад Уланскім завулкам была аптэка яўрэя Сімы Каплан, за ёй яшчэ адна крама, далей – дзяржаўная аптэка, у будынку якой працавала таксама дантыст Катовіч. Побач стаяў двухпавярховы гатэль “Варшаўскі”, якім валодаў Камянковіч. Бліжэй да Полацкай вуліцы стаялі будынкі цырульні, дзяржаўнай манаполькі і чайныя Орчыка і Крэмера. Паміж завулкам Уланскім і вуліцай Полацкай стаяў “Дом Людовы” (“народны дом”) – накшталт сённяшняга дома культуры. Тут ставіліся тэатральныя пастаноўкі і канцэрты. Па суботах і нядзелях сюды прыязджаў польскі вайсковы аркестр з Будслава, а таксама яўрэйскі духавы аркестр з Глыбокага. Па святах ставіў прадстаўленні мясцовы аматарскі тэатр.



У Доме Людовым працаваў буфет, але, як успамінаюць старажылы, кошты там не ўстанаўліваліся, а дзейнічаў прынцып “хто колькі дасць”. Багатыя гараджане і паны на грошы не скупіліся і давалі ў некалькі разоў больш сапраўднай цаны. Частку сродкаў, атрыманых ад Дому Людовага, адміністрацыя горада накіроўвала на дапамогу дзецям маламаёмасных гараджанаў, якім куплялі вопратку ды абутак.

На месцы сённяшняга “Беларусбанка” стаяў будынак гарадскога магістрата. Бурмістрам горада быў у 1929 годзе Генрык Венцлавовіч (уладальнік маёнтка Норвідполле каля Таргуноў), пазней Жэгота (уладальнік фальварка Заручча каля Валасаткі), пасля яго Ян Гура, які кіраваў гарадскімі справамі да сумна вядомага верасня 1939 года, калі быў арыштаваны. Ян Гура, па ўспамінах старажылаў, вельмі патрабавальна ставіўся да чысціні і парадку ў горадзе. Кожную раніцу ён асабіста абыходзіў гарадскія вуліцы, і калі заўважаў каля чыйго-небудзь дома смецце, выпісваў штраф.

А перад тым як тут пабудавалі “Беларусбанк”, на гэтым месцы быў невялікі базар.

На месцы сённяшняга ваенкамата быў будынак суда. У канцы вуліцы была амбулаторыя фельчара Шашко. Вуліцу, як і сёння, упрыгожвала свята-Пакроўская царква. Пажылыя расказваюць, што аднойчы ў царкву фашысты сагналі ваеннапалонных. Жыхары горада сабралі усё, што ў каго было, каб заплаціць немцам за тое, што палонных выведуць са святога месца.

Каля царквы, пры скрыжаванні з вуліцай Манюшкі (Піянерскай) стаяў помнік Юзэфу Пілсудскаму, каля якога на дзень незалежнасці, дзень канстытуцыі, а таксама ў дзень нараджэння і смерці Пілсудскага стаяў пачэсны караул, узнімаўся дзяржаўны сцяг. Да сённяшняга дня захаваліся два жалезныя слупкі ад былой агароджы помніка.

На цяперашняй новай плошчы каля райвыканкома стаяў яшчэ зусім нядаўна адзін будынак. Ён выдаваўся са строю на самы тратуар і не даваў людзям нават размінуцца. Пры Савецкай уладзе тут была міліцыя, а ў ваенны час нямецкая камендатура. Жыхары не вельмі хочуць расаказваць пра гэтае

жудаснае месца, пра тыя катаванні людзей, якія тут адбываліся. У апошні час у будынку месцілася статыстычнае бюро Докшыцкага раёна і некалькі майстэрань-крам. Перад пашырэннем плошчы, якое праводзілася да 600-годдзя Докшыц, будынак знеслі.

На перакрыжаванні вуліц Барысаўская і Манюшкі стаяў будынак, які быў спачатку клубам, у гады вайны немцы ў ім зрабілі канюшню. У апошні час тут месціліся крама “Кіпарыс” і мясная лаўка племзавода “Порплішча”. А вакол яго кожную пятніцу праходзіў кірмаш. Аднак і яго знеслі нядаўна пры пашырэнні плошчы.





На месцы сярэдняй школы № 2 і былой аўтастанцыі знаходзіўся выган, дзе пасвілі кароў. Тут жа быў потым аэрадром. А вось на цяперашнім стадыёне ў часы нямецкай акупацыі ў 1941 годзе быў лагер ваеннапалонных. Целы загінуўшых ад голаду, ад знямогі, закатаваных або расстраляных палонных скідвалі ў яму. Сёння тут знаходзіцца брацкая магіла.





Докшыцкая сярэдняя школа

З другога боку вуліца Барысаўская была забудавана пераважна жылымі дамамі. Тут былі дзве яўрэйскія крамы, на перакрыжаванні з вуліцай Міцкевіча жыў урач Ільін (на гэтым месцы зараз стаіць “Універсам”). Далей размяшчалася майстэрня рымароў Бегуноў. На скрыжаванні з вуліцай Піянерскай стаяў двухпавярховы будынак няпоўнай сярэдняй школы. У ім было чатырнаццаць пакояў. А там, дзе зараз знаходзіцца Дом быта, была кузня Вайцяховічаў.

А вось і **вуліца Адама Міцкевіча**. Гэта адзіная з вуліц горада, назва якой не зменьвалася. Паэта Міцкевіча паважалі не толькі польскія ўлады, але і савецкія. Сённяшняя вуліца – гэта даволі абжыты раён. Да вайны яна не даходзіла нават да перакрыжавання з вуліцай Маякоўскага, якой тады таксама яшчэ не было. Апошні дом стаяў там, дзе зараз вулачка паварочвае на вуліцу Школьная. Далей з правага боку была вялікая сажалка, дзе нават вадзілася рыба. Бруку на вуліцы не было, жылі на ёй, у асноўным, докшыцкія

мяшчане. Да сённяшняга часу захаваўся дом Ляговіча, у якім зараз жыве яго дачка з сям’ёй.



*Дом Ляговіча (Шымановіча)*

Выходзім на **вуліцу Палявога** (тады яе называлі Палявая). Будавацца яна пачалася ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. Тут некалі быў загарадны маёнтак памешчыка Чаховіча. На месцы цяперашняга будынка райваенкамата стаяла яго асноўнае збудаванне. Вялікі, прыгожы дом з фруктовым садам быў абнесены моднымі на той час ліпамі. Там, дзе цяпер разбіты парк, стаялі гаспадарчыя пабудовы. Ішоў час, адбываліся падзеі, мянялася ўлада: палякі, бальшавікі, немцы. Панскі дом быў аддадзены пад казіно, ва ўладанне афіцэраў, затым – пад рэвалюцыйны камітэт.

Больш актыўна сталі будавацца на вуліцы ў час уладання пана Чаховіча. Ён прадаваў зямлю, а дробныя рамеснікі куплялі ўчасткі і будавалі дамы. Пясок з кар’ера, што знаходзіцца між вуліцамі Палявога і Маякоўскага, выкарыстоўвалі, калі будавалі Свята-Пакроўскую царкву ў Докшыцах. Пачыналася будоўля праваслаўнага храма ў 1900 годзе. 2 жніўня 1900 года, як сведчыць царкоўны летапіс, “совершена закладка новой каменной церкви на средства казны во имя Покрова Пресвятой Богородицы, на подаренном городом плацы, против домов Ткаченко, и в том же году выложен фундамент”. У 1903 годзе пабудова новай царквы была поўнасцю завершана. 28 верасня адбылося асвячэнне храма. У царкве былі чатыры званы. У 1915 годзе перад наступленнем немцаў яны былі знятыя і перавезеныя на захаванне ў Барысаў. У 1921 годзе званы аказаліся на іншым баку мяжы. Тагачасны святар Мікалай Пляшчынскі так і не дабіўся іх вяртання. У 1930 годзе вакол царквы была ўзведзена мураваная агароджа. У савецкі час царква дзейнічала. Зрэшты, з-за страху і атэістычнай прапаганды туды хадзіла мала людзей. Зараз жа сітуацыя змянілася ў лепшы бок.



У 1925 годзе на вуліцы Палявого пачалі будаваць татарскую мячэць, настаяцелем (мулой) быў тады Сулейман Якубоўскі.

Невядома чаму ў час Вялікай Айчыннай вайны Палявая пацярпела менш, чым іншыя вуліцы. Магчыма таму з 1946 года на ёй размяшчаліся райвыканком з усімі аддзеламі, райком камуністычнай партыі.

Вось мы выйшлі да самай доўгай вуліцы горада – **вуліцы Піянерская**. Зараз яна пачынаецца новымі дамамі, пабудаванымі за бальніцай уздоўж дарогі на вёску Вецяра, а заканчваецца домам № 116 і ўпіраецца ў поле за вуліцай Чарняхоўскага. За польскім часам яна была ў некалькі разоў меншай і насіла імя польскага кампазітара Манюшкі. У прамежку паміж вуліцамі

Ленінскай і Маякоўскага тады значыліся толькі некалькі дамоў, гаспадарамі якіх былі Шасцярэннік (зараз гэта дом № 14), браты Шкапцы (№ 12), Зімановічы (№ 20), Квачонак, Пагоцкія (№10). На другім баку стаялі хаты Марыі Барысевіч, Зімніцкіх, Астроўскай (№ 15), Геляновіча (№ 17). Мела месца практыка, калі багацейшыя мяшчане выкуплялі так званыя "пляцы" (20 сотак), і тады іх сядзібы доўжыліся ад адной вуліцы да другой. Напрыклад, хата стаяла на Манюшкі, а агарод заканчваўся на Міцкевіча. Крыху больш заселенай была другая частка вуліцы, якая доўжылася да Ветранай (вуліцы Гайдара). На месцы сённяшняй крамы "Стронг" стаяла хата падпольшчыка Лукі Кастоўскага, які неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі за падпольную дзейнасць. Захаваўся дом паштальёна Будзіча (№ 38), дзе адразу пасля вайны знаходзілася рэдакцыя раённай газеты "Ленінская праўда". У гэтым жа доме працавала і друкарня, а на гарышчы ў летнім пакоі жылі дзяўчаты-наборшчыцы, у тым ліку і Леаніда Маркавец. З даваенных пабудоў на гэтым участку вуліцы знаходзяцца яшчэ дамы №№ 23 і 29. Гаспадары апошняга ў першую хвалю эміграцыі выехалі ў Польшчу і будынак аддалі пад аптэку, зараз там знаходзіцца "Оптыка".



Дом № 38



Дом № 29



Дом № 14

На месцы сённяшняга парку былі агароды, потым стадыён. У гэтым баку вуліцы жылі карэнныя дакшычане. У доме, дзе зараз жыве паважаны старажыл горада У.К. Жукоўскі, у гады вайны жыў мешчанін Барысевіч, які ўсю вайну хаваў докшыцкага яўрэя. Пазней тут быў камітэт дзяржбяспекі. З правага боку перад сённяшнім завулкам Піянерскім размяшчаўся рынак, дзе прадавалі жывёлу.

Гаворачы пра вуліцу Піянерскую, ніяк нельга абыйсці ўвагай **вуліцу 17 Верасня,** бо ў свой час яна была важнай для горада. Тут знаходзіліся кашары польскай пагранічнай часці. Пасля вайны ў былой салдацкай сталовай размясціўся гарадскі клуб, дзе паказвалі кінафільмы і канцэрты. І хоць далекавата было хадзіць гараджанам, але на той час гэта быў адзіны ачаг культуры.

На вуліцы ў царскі час быў пакладзены брук. А ў 1969 годзе – асфальт. Тратуары на вуліцы былі заўсёды.

# Докшыцы ў паэтычных радках

## *Са святам, Докшыцы*

У Бярэзіне сонца промні палошча
Дзень працоўны агнём дагарае.
Як прыгожа наўкола, на плошчы
Горад усіх землякоў вітае.

Мы віншуем горад са святам!
Аднавіўся, прыгожым ён стаў.
Ураджай сабралі багаты
Шмат зрабілі карысных спраў.

Нашы Докшыцы ў чаканні,
У падрыхтоўцы з дня ў дзень
Горад наш у святочным убранні
Ён жыве ў віхуры падзей.

Няхай песня ліецца шырока
І музыкі старанна граюць
Госці едуць зблізку, здалёку
Свята, горад наш людзі славяць!

*І.Козел*

## *Майму гораду Докшыцы*

Зачараваны з даўніх часін
Я сваім гарадком невялікім,
Непатрэбна мне лепшых мясцін,
У ім мой жыццёвы набытак.

Колькі помню, прыгожым ён быў,
І цяпер патанае ў кветках.
А Бярэзіны нашай разліў!
А навокал прасторы палеткаў!

Я – жыхар твой, а ты мне – святло,
Многа зменіцца тут пакаленняў,
У радасць людзям тваё хараство,
І цябе нам нішто не заменіць.

Горад наш, харашэй, прыгажэй,
Самы лепшы, утульны, квяцісты,
Горад добрых, прыемных людзей,
І душою, і сэрцам чысты.

*Пётр Георгіевіч ПЯТРОВІЧ,*

## Мой родны горад

Ёсць мясціна, для сэрца адданая,–
Гэта горад, дзе лёгка жывецца.
Побач людзі ўсе  паважаныя,
І жыццё, нібы песня, ліецца.

Але ёсць і часіны, кранутыя болем,
Дзядамі адзначаны кроўнаю  доляй.

Мы не забудзем іх добрыя справы,
Якія зрабілі  яны для дзяржавы.

Чысціню, прыгажосць наваколля
Навучыцца нам трэба цаніць,
І каб свет быў заўсёды прывольным,
Трэба добрыя справы рабіць.

*Яўген Я., СШ №1 г.Докшыцы.*

## *Мой город*

Умывается утро росою,
Первый луч озарил купола.
Просыпается дружной семьёю
Город мой и Отчизна моя.

Пробуждается жизнь на рассвете,
Первый шаг, первый шум, там и тут.
Собираются взрослые, дети,
На работу и в школу идут.

Незаметно из года в год
Славят Докшицы руки рабочие наши.
Город строится, город растёт,
С каждым днём становится краше.
Ты поднялся с руин и пожарищ.
Было всё: и невзгоды, и раны.
Ты – защитник, ты – брат  и товарищ,
Честь тебе отдают ветераны.

Город Докшицы – город-творец,
Гербом-символом нашим украшенный.
Город-труженик, город-боец,
Славься, славься людьми отважными!

Хлебом-солью встречай гостей,
Наша Докшицкая земля.
Город мой, расцветай, зеленей…
Мы гордимся тобой,
С Днём рожденья тебя!

*Ирина КОЗЕЛ*

## ДОКШИЦАМ

Люблю тебя, моя земля родная,
Люблю тебя, горжусь тобой.
Нет у любви моей конца и края,
Мой город милый над Березиной.

Беречь тебя я твёрдо обещаю,
Быть за тебя стеной. Тебе 600,
Но для меня ты молодой. С годами
Всё краше ты, мой город дорогой.

Лучшее место на всём белом свете!
Докшицы, вам я рожденьем обязана.
Так поздравляю улыбкой и песней
Город, с которым все ценное связано!

*МАЛЮЖЕНЕЦ Влада*
*ученица СШ №1 г.Докшицы*

## *ЮБІЛЯРУ*

Горад мой, ты дзіўны прыгажун
У кароне ізумруднай лета.
Роскашай каштанавых букетаў
Не адну кранаеш ты душу.

У калысцы цёплай травяной
Песціш ты вытокі рэк вядомых:
Поіш з двух жбаноў адначасова
Моры два крынічнаю вадой.

Вечна малады мой старажыл,
Ведаю, што ныюць у разводзе
Раны, што пакінулі стагоддзі,–
Гора ты нямала перажыў.

Шмат разоў крывавіла твой лёс
Прагавітасць ненаедных войнаў,
Толькі адраджаўся ты павольна,
Харашэў і паступова рос.

Крочыш нетаропка па жыцці,
Дыхаючы рэдкай чысцінёю.
Хай жа век не гасне над табою
Зіхаценне мірнае свяціл!

*Марыя Лук'яненка,*
*"Родныя вытокі"*

## *Докшыцы*

Сінявокімі азёрамі,
Спевам лесу, хлебным Коласам,
Песняй звонкаю над пракосамі
Родны край мой любы выпешчан.

І ў цёплых промнях сонейка,
Дзе выток ракі Бярэзіна.
Гарадок пад назвай Докшыцы
Нібы каласок усё спеліцца.

І жывуць тут людзі слаўныя —
Працавітыя, руплівыя,
І вясёлыя, і дбайныя,
І прыгожыя, і гасцінныя.

600 год Докшыцы стаяць,
І квітнеюць, і не старацца.
Пажадаем жа ў юбілей
І далей гарадку толькі славіцца.

Ганарымся мы докшыцкай зямлёй,
Ганарымся мы дакшычанамі.
Хай жа песні гучаць над старонкай маёй
З лепшымі, ад сэрца, пажаданнямі!

*Яўгенія МАЛЕВІЧ*

## *Дзеячы мастацтва з Докшыц*

Наш невялікі старажытны гарадок стаў радзімай адораных Богам творцаў у самых розных галінах мастацтва. Докшыцы – гэта калыска вядомых беларускіх мастакоў Маркаўцоў. Віктар Маркавец напісаў звыш 200 карцін, якія набылі вядомасць на радзіме і ў замежжы. Знакавым творам сярод іх можна назваць карціну "Свята ў Докшыцах". Творы мастака знаходзяцца ў многіх мастацкіх музеях Беларусі, Расіі, Польшчы.

Не менш таленавітыя і яго сёстры Валянціна Маркавец-Бартлава і Галіна Крываблоцкая. Валянціна Пятроўна працуе ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (габелен), а таксама ў галіне распрацоўкі і мадэліравання трыкатажных вырабаў, сцэнічных касцюмаў. Яна ўдзельніца многіх выстаў, член Беларускага саюза мастакоў, загадчык кафедры Беларускай акадэміі мастацтваў, дацэнт. Узнагароджана шэрагам узнагарод за заслугі ў выяўленчым мастацтве. Галіна Пятроўна скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Працуе выкладчыкам Беларускага каледжа мастацтваў. Як і сястра, яна дасягнула значных вяршынь у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Вядомы яе міні-габелены, рэпрэзентатыўныя мастацка-вобразныя кампазіцыі, выкананыя ў розных тэхніках і матэрыялах. Творы мастачкі таксама знаходзяцца ў многіх музеях Беларусі, Украіны, Польшчы, прыватных калекцыях ЗША, Індыі, Германіі.

Дакшычане беражліва захоўваюць памяць аб сваім таленавітым земляку Сяргею Вішнеўскім. Творчая спадчына гэтага майстра багатая і разнастайная. Ён аўтар партрэтаў сям'і паноў Слатвінскіх, якія паспрыялі таму, каб таленавіты хлопец з беднай сям'і стаў студэнтам мастацкай вучэльні ў Вільні. У сталым узросце Сяргей Антонавіч захапіўся напісаннем краявідаў і нацюрмортаў. Спрабаваў сябе ў маляванні царкоўных абразоў. Пакінуў вялікую мастацкую спадчыну ў фотатворчасці. У 50-я гады ў Докшыцах ён арганізаваў фотамайстэрню і трымаў яе на вельмі су'ёзным мастацкім узроўні. Ужо ў наш час намаганнямі Віктара Маркаўца ў Мінску ў галерэі фальварка "Добрыя думкі" была арганізавана выстава жывапісу і фотамастацтва нашага земляка.

Свой талент Сяргей Вішнеўскі перадаў сыну Аляксандру. Прафесійны мастак Аляксандр Сяргеевіч Вішнеўскі працуе ў Доме рамёстваў. Ён піша карціны, а некалькі год таму вырашыў паспрабаваць сябе ў кераміцы, дзе дасягнуў поспеху і прызнання. А.С. Вішнеўскі з'яўляецца лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва "Кругазварот-1998", удзельнікам і дыпламантам рэспубліканскага свята "Ганчарны круг" на працягу некалькі год.

У Доме рамёстваў працуе шмат людзей, прагных да мастацтва. Таксама прафесійны мастак Іван Плыгаўка зараз спецыялізуецца на разьбе па дрэве. Розныя пано, драўляная скульптура, у прыватнасці драўляныя механічныя цацкі – гэта тыя рэчы, дзе ў поўнай меры праявіўся талент творцы. Іван Парфір'евіч з'яўляецца лаўрэатам 1-га рэспубліканскага свята-конкурса разьбярства "Дрэва жыцця", лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва "Кругазварот-1988".

З пад рук апантанага майстра сваёй справы Наталлі Пятровіч выходзяць сапраўдныя цуды ткацтва. Нездарма ў 2003 годзе яна стала членам рэспубліканскага Саюза майстроў народнай творчасці.

Майстэрства лазапляцення Таццяны Гаварцовай і Алега Войніча адзначаны сёлета першай і трэцяй прэміямі на "Славянскім базары ў Віцебску".

Індывідуальнасць і прафесіяналізм характэрны для работ Таццяны Махніст. Яна стала лаўрэатам 2-й прэміі на 1-м рэспубліканскім святе-конкурсе саломапляцення "Саламяны цуд"і была ўзнагароджана Ганаровай граматай за выкананне саламянай скульптурнай кампазіцыі "Купальская лялечка".

На Брэстчыне плённа працуе яшчэ адзін мастак з Докшыц Ігар Абуховіч. Гэта родны брат Таццяны Яўгенаўны. Яго карціны экспанаваліся на выставах у Віцебску, Брэсце, Германіі. Ён быў аўтарам ілюстрацый да серыі кніг беларускага пісьменніка А.Бернардскага.

*Тамара Альшэўская, "Родныя вытокі"*

# *Літаратура*


1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996-2003.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць – Мінск: Бел. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – С.242 – 258.
3. Их именами названы…: Энциклопедический справочник. – Мінск: БелСЭ, 1987. – 711 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993-2003.
5. Газета "Родныя вытокі". – 2008 – 2012.
6. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік /А.М. Кулагін – Мінск: БелЭн, 2000.
7. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М.Кулагін – Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.
8. Легенды і паданні Докшыцкага краю. – Докшыцы, ЦДТ, 2001. – 68 с.
9. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна: рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.
10. Шуневка. Мінск: Беларусь, 1985. – 32 с.


# *Інфармацыйны рэсурс*


1. http://dokshitsy.vitebsk-region.gov.by/ru/
2. https://ru.wikipedia.org/wiki/%C4%EE%EA%F8%E8%F6%EA%E8%E9_%F0%E0%E9%EE%ED
3. http://www.radzima.org/ru/photos_/dokshitskiy.html
4. http://www.radzima.net/ru/rayon/dokshycki.html
5. http://globus.tut.by/_regs/dokshic_tn.htm
6. http://westki.info/artykuly/11761/doksickiy-rayon-bielarus-doksicy-krulievshchina-biehoml-parafianovo-novosti-doksic